**Адасобленыя члены сказа**

Тэставая работа

1. ***Вызначце сказ з адасобленым азначэннем*** *(улічыце, што знакі прыпынку не пастаўлены).*

Я вярнуўся ў пакой і не запальваючы свечкі сеў на ложак.

Стары настаўнік ішоў накульгваючы.

Яны нейкі час нічога не бачылі ля сябе апроч цьмянага снежнага поля.

Апрануты ён стаяў пасярод хаты і зашпільваў на кажуху гузікі.

Калісь гадоў пяць таму я тут ужо быў.

2. ***У якіх сказах прыдаткі з'яўляюцца адасобленымі?***

Шырокай светлай паласой нясе свае воды Дняпро любімая рака ўсходніх славян.

Чалавек стрыманы і далікатны ён усё ж не змог прамаўчаць цяпер.

Сусед Васіль з вядром хутчэй парыпаў лапцямі да хлява.

Флора або раслiннасць Белавежскай пушчы зацікавіла вучоных іншых краін.

Класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч – аўтар зборніка "Вянок".

3. ***Знайдзіце і адзначце сказ, у якім неабходна выдзеліць коскамі азначэнні.***

З-за лесу пачала выпаўзаць акаймаваная абадком чэрвеньскага сонца хмара.

Сабраныя ў кошык антонаўкі смачна пахлі.

У лесе змярцвелым і суровым было зацішна і нават цёпла.

Пераскокваючы з аднае галінкі на другую вавёрка кідала на мяне цікаўныя позіркі.

Усе за выключэннем Кавалевіча выйшлі з пакоя.

4. ***Адзначце сказ, у якім выдзеленыя курсівам слова(ы) адасабляе(ю)цца.***

Тады *на дзірванiстым* пагорку было зусім зацішна.

Малы сядзеў на канапе *надзьмуўшыся.*

LIVEWORKSHEETS

*Не задумваючыся* Пракоп паглядзеў на брата і адмовіўся ад прапановы.

*Выдатны паэт і крытык* Максім Багдановіч вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй.

Ён сеў у машыну *замест шафёра.*

***5. Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў.***

Ганна, апрануўшыся, выйшла з хаты.

Ціха крадучыся падступаў змрок.

Радасны Васілёк пабег дамоў, падскокваючы.

Нягледзячы на мароз на вуліцы было многа народу.

Няма чаго сядзець склаўшы рукі.

LIVEWORKSHEETS